**Т. І. Гарановіч**

# КАСКАДНАСЦЬ ЯК ЗАКАНАМЕРНАСЦЬ ФУНКЦЫЯНАВАННЯ СІНТАКСІЧНЫХ ФРАЗЕАЛАГІЗМАЎ У БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

У выніку аналізу кантэкстаў, у якіх ужываюцца беларускія сінтаксічныя фразеалагізмы (далей – СФ), намі выяўлены выпадкі выкарыстання двух і больш СФ адной або некалькіх мадэлей у адным або ў суседніх сказах. Для

наймення такіх спалучэнняў СФ мы прапануем тэрмін *каскад*, якім у фігурным катанні называецца від камбінцыі скокаў, што выконваюцца адзін за адным і аб'ядноўваюцца агульнай тэхнічнай ці эстэтычнай задумай.

У беларускай мове намі вылучаны тры структурна-семантычныя тыпы каскадаў СФ:

1) каскады з двух і больш СФ адной мадэлі з аднолькавым значэннем: *Разлажэнне дысцыпліны Шатруном яго раздражняла.* ***Армія ёсць армія**, **і вайна ёсць вайна**. А ён камандзір баявой роты* (І. Шамякін) – СФ *армія ёсць армія* і *вайна ёсць вайна* ўтвораны на аснове адной мадэлі *N+ёсць+N* і маюць аднолькавае значэнне ‘наяўнасць пэўных асаблівасцей, заканамернасцей, уласцівасцей’, якое ў дадзеным кантэксце прадугледжвае высокую ступень дысцыплінаванасці людзей; *Дровы, мусіць, нам папаліся сырыя і асінавыя. А тут смалячок напачатку павінен быў. А пасля ўжо дубовыя ды бярозавыя паленцы… Мы ж не здагадаліся прасушыць іх на сонцы, правеяць скразнячком, каб **касцёр потым быў дык касцёр**, каб **полымя з яго – дык полымя**!* (А. Бароўскі) – СФ *касцёр потым быў дык касцёр* і *полымя з яго дык полымя*, утвораныя паводле адной мадэлі *N+дык+N*, маюць аднолькавую семантыку ‘сапраўднасць, паўнацэннасць’;

2) каскады з двух і больш СФ розных мадэлей з аднолькавым значэннем: – *Арцём Захаравіч, што ж ты рэжым дня парушаеш? З цябе бяруць прыклад… Бародка засоп у трубку і адказаў не адразу. –* ***Які там** да д'ябла **рэжым**. Рэжым – гэта для ўсіх іншых. А **нам**, **сакратарам сельскіх райкомаў**, **не да рэжыму зараз*** (І. Шамякін) – СФ *які там рэжым* мадэлі *які там+X* утварае каскад з СФ *нам, сакратарам сельскіх райкомаў, не да рэжыму* мадэлі $N/Pron_{pers\,Dat}$ + *не да* + $N/Pron_{pers\,Gen}$, абодва СФ выражаюць немагчымасць; ***Куды ж тут было лезці ўжо яму са сваёю гаворкаю**! **Не да таго цяпер Андрэю**. **І сёння**, **і доўга яшчэ будзе не да таго*** (М. Гіль) – СФ мадэлі $Pron/Adv_{inter}$ + $Pron_{pers}/N_{Dat}$ + $V_{inf}$ (*куды ж тут было лезці ўжо яму са сваёю гаворкаю*) утварае каскад з двума СФ мадэлі $N/Pron_{pers\,Dat}$ + *не да* + $N/Pron_{pers\,Gen}$ (*не да таго цяпер Андрэю* и *і сёння, і доўга яшчэ будзе не да таго*), усе СФ у каскадзе выражаюць немагчымасць;

3) каскады з двух і больш СФ розных мадэлей з розным значэннем: “***Што було, тое було**… Няхай шкода, а не вернеш…” – зноў нібы пачуў ён. І зноў зазлаваў на матку, на дзеда: “Легко вам ето казаць! Усё вам легко! Вы **толькі і ўмееце**, што вярэдзіць душу! А самі і **знаць не знаеце**, як яно чалавеку!..*” (І. Мележ) – каскад утвараюць СФ мадэлі $Pron/Adv_{rel}$ + *прэдыкатыўная аснова* + $Pron/Adv_{dem}$ + *прэдыкатыўная аснова* (*што було, тое було*) з семантыкай незваротнасці, СФ мадэлі *толькі і* + *X* (*толькі і ўмееце*) з семантыкай адзінасці, выключнасці і СФ мадэлі $V_{inf}$ + *не* + $V_{fin}$ (*знаць не знаеце*), які выражае акцэнтаванае сцвярджэнне; *Я думаў, там **машына дык машына**. Ажно – нічого асобеннага. Можа, нават меншая за той паравозік, што некалі бегаў у нас па вузкакалейцы.* ***Куды ёй пацягнуць тры вёскі**!* (З. Прыгодзіч) – каскад утвораны СФ мадэлі *N+дык+N* (*машына дык*

*машына*), які выражае сапраўднасць, паўнацэннасць, і СФ мадэлі $Pron/Adv_{inter}$ + $Pron_{pers}/N_{Dat}$ + $V_{inf}$ (*куды ёй пацягнуць тры вёскі*) з семантыкай няздольнасці.

Калі каскад скокаў у фігурным катанні робіць выступленне спартсмена больш складаным, цікавым, відовішчным, то каскад СФ дазваляе перадаць багацце і разнастайнасць модусных сэнсаў, якія, у сваю чаргу, адлюстроўваюць шматграннасць, глыбіню і складанасць думак і пачуццяў чалавека.

Паколькі ў нашым фактычным матэрыяле вылучаны цэлы шэраг спалучэнняў СФ, мы адносім каскаднасць да заканамернасцей функцыянавання беларускіх СФ у маўленні.